# «Добра было б, калі б усе дзяржавы ўзялі і адмянілі войны»

З першых вуснаў



Фота БелТА.

**Яшчэ старажытныя рымляне ведалі: хочаш міру, рыхтуйся да вайны. А Напалеон пазней сказаў: народ, які не хоча карміць сваю армію, будзе карміць чужую. Мірная Беларусь далёкая ад імперскіх амбіцый, але і сябе ў крыўду даваць не будзе.**
**Гэта яшчэ раз пацвердзілася падчас наведвання Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам вопытна-выпрабавальнага ўчастка навукова-вытворчага таварыства з абмежаванай адказнасцю «АКБ ТСП» у Мачулішчах. Першае, што адзначыў беларускі лідар пасля прылёту, — ёсць шэраг пытанняў, перш за ўсё па выкананні праграмы развіцця ракетнай вытворчасці.**

«Добра было б, калі б усе дзяржавы ўзялі і адмянілі войны. Можа, дажывём, але пакуль яшчэ ніхто не адмяняе войны, нягледзячы на рознага роду пандэміі, эпідэміі, істэрыі. На жаль, да вайны прыходзіцца рыхтавацца ў мірны час. Нікуды не дзенешся: калі не будзеш рыхтавацца (не дай бог, вядома) да вайны зараз, то будзеш пажынаць горкія плады потым», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што стратэгічная задача — у выпадку пагрозы нанесці непрымальны ўрон праціўніку, і гэта краіна мусіць дэманстраваць.

СТАР. 2

# «Добра было б, калі б усе дзяржавы ўзялі і адмянілі войны»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

«Каб тыя, хто, не дай бог, уздумае з намі ваяваць, разумелі, што мы можам адказаць і адказаць годна. ***Самы лепшы адказ з пункту гледжання ўзбраенняў на сённяшні дзень — гэта ракеты, высокадакладная зброя. І ў сілу таго, што наша краіна лясістабалоцістая (гэта заўсёды давала нам перавагу), мы сваю армію прыстасоўваем да барацьбы і ў гэтых умовах»***, — адзначыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што міралюбівая Беларусь не збіраецца займацца глабалізмам, захопліваць чужыя дзяржавы, — у гэтым няма ні магчымасці, ні неабходнасці. Падобнай цікавасці да нас няма і з боку іншых краін.

«Таму міжкантынентальныя балістычныя ракеты з ядзернай зброяй нам няма сэнсу распрацоўваць, мы і не можам гэта рабіць — гэта вельмі дарагая рэч. Нам гэта ў прынцыпе на сённяшні дзень і не трэба, мы павінны арыентавацца на тое, што магчыма. Таму мы ствараем адпаведныя ракетныя вытворчасці. Я не скідаю з рахунку стралковую зброю, бранетанкавую тэхніку, сродкі ППА — мы гэта ўсё паказалі на парадзе», — нагадаў Аляксандр Лукашэнка.



Прагарама развіцця ракетнай вытворчасці ў Беларусі рэалізуецца ў 2017—2020 гадах, яна стала працягам праграмы 2011—2016 гадоў. Мэты ў яе дзве: знізіць залежнасць краіны ад закупак дарагога ўзбраення за мяжой і ствараць айчынныя ўзоры ракетнай тэхнікі, канкурэнтаздольнай на сусветным рынку. Заказчыкі — Дзяржкамваенпрам і Нацыянальная акадэмія навук. У праграме ўдзельнічаюць арганізацыі дзяржаўнай і прыватнай формаў уласнасці.

## Хутка і далёка

Ракеты, якія цяпер знаходзяцца на ўзбраенні ў Беларусі, маюць далёкасць паражэння дзвесце кіламетраў. У нашай краіне асвоена зборка кітайскіх ракет — «трохсотак», але пастаўлена задача распрацаваць уласнае ўзбраенне такога кшталту. Ужо ў верасні чакаюць іх выпрабаванняў, але затрымка за палігонамі, на якіх падобныя выпрабаванні можна правесці. У Беларусі такіх няма: нашы дазваляюць страляць на далёкасць не больш за трыццаць кіламетраў. Прэзідэнт падрабязна пацікавіўся ўмовамі ў кожнай магчымай краіне, у тым ліку ў найбліжэйшых суседзяў.

Аляксандр Лукашэнка выказаў гатоўнасць на ўзроўні лідараў краін дамовіцца на правядзенне выпрабаванняў, напрыклад, у КНР.

***«Нам патрэбная свая ракета. Мы не можам ствараць зброю, па якой будзем залежаць ад іншых краін***. Ніхто гэту зброю проста так не дасць. Гэта нам яшчэ пашанцавала дамовіцца з кітайцамі. Але далей залежнасці гэтай быць не павінна», — абазначыў задачу Прэзідэнт.

## Каб выратаваць экіпаж

«АКБ ТСП» — інавацыйнае прадпрыемства, заснаванае ў 2002 годзе. Асноўнымі кірункамі дзейнасці з'яўляюцца: глыбокая мадэрнізацыя існуючых узораў узбраення і ваеннай тэхнікі, правядзенне навукова-тэхнічных і ваенна-навуковых даследаванняў, распрацоўка і серыйная вытворчасць новых сістэм узбраення і іх элементаў і прылад падвойнага прызначэння, а таксама распрацоўка і вытворчасць апаратна-праграмных сродкаў для сістэм кіравання войскамі і зброяй.



Аляксандру Лукашэнку прадэманстравалі найноўшае ваеннае беларускае ўзбраенне, сярод якога — рэактыўная сістэма залпавага агню, зенітна-ракетныя комплексы і рабатызаваныя тэхніка, ракетнае ўзбраенне.

Дырэктар аднаго з распрацоўшчыкаў ваеннай тэхнікі — ТАА «БСВТ — Новыя тэхналогіі» — Філіп Баранаў, паведаміў, што прымяненне рэактыўнай сістэмы залпавага агню (РСЗА) «Флейта» на базе лёгкабраніраванага аўтамабіля істотна павышае жывучасць экіпажа, а таксама дазваляе выкарыстоўваць авіяцыйныя ракеты ў наземнай тэхніцы. Дзякуючы сучаснай сістэме інфарматызацыі час падрыхтоўкі пуску складае менш за хвіліну. Прымяненне падобных комплексаў на рабатызаваных дыстанцыйна кіруемых комплексах таксама, па словах дырэктара, дазваляе «захаваць асабовы склад».

Адна з асноўных надзённых тэм зараз — гэта барацьба з маламернымі дыстанцыйнымі кіруемымі беспілотнымі апаратамі, растлумачыў дырэктар прадпрыемства.

«Для супрацьдзеяння ім створаны рабатызаваны комплекс «Берсерк». З выкарыстаннем двух кулямётаў ГШГ калібрам 7,62 міліметра, дзякуючы высокастрэльнасці (12 тысяч стрэлаў у хвіліну) ён можа эфектыўна паражаць маламерныя беспілотныя лятальныя апараты на адлегласці да аднаго кіламетра. А выкарыстанне сучасных метадаў апрацоўкі выявы навядзення на цэль дазваляе істотна знізіць нагрузку на аператара», — расказаў Філіп Баранаў.

«БСВТ — Новыя тэхналогіі» таксама рамантуе авіяцыйныя кіруемыя ракеты Р-73, Р-60 і Р-27. За мінулы год адрамантавана 110 авіяцыйных кіруемых ракет Р-27, паведаміў кіраўнік прадпрыемства.

Комплекс «Паланэз-М» прадставіў дырэктар «Завода дакладнай электрамеханікі» Юрый Чорны.

«За апошнія пяць гадоў завод дакладнай электрамеханікі як галаўное прадпрыемства комплексаў РСЗА буйнога калібру ў кааперацыі з іншымі прадпрыемствамі ваенна-прамысловага комплексу распрацавала лінейку комплексаў «Паланэз», — расказаў ён. — Усе яны прайшлі поўны цыкл распрацоўкі і правядзення баявых стрэльбаў на палігонах Беларусі і замежных дзяржаў».



Па ацэнцы еўрапейскіх і азіяцкіх экспертаў, «Паланэз-М», які выкарыстоўвае два тыпы ракет — з далёкасцю паражэння да 200 і да 300 кіламетраў, з'яўляецца адным з найлепшых у сваім класе, праінфармаваў кіраўнік прадпрыемства.

«Акрамя таго, у гэтым комплексе закладзены вельмі вялікі мадэрнізацыйны патэнцыял, які невычарпальны на найбліжэйшыя 20 гадоў, — дадаў ён. — Трэцяя асаблівасць згаданага комплексу прастата і зручнасць эксплуатацыі».

## На мірную і добрую памяць

Падчас вывучэння ўзораў беларускай тэхнікі Аляксандр Лукашэнка пакінуў подпіс на першай зенітнай кіруемай ракеце беларускай вытворчасці, запуск якой адбыўся сёлета 19 лютага — ЗРК «Бук». Мадэль гэтага комплексу была падорана кіраўніку дзяржавы на памяць пра наведванне вопытна-выпрабавальнага ўчастка «АКБ ТСП» у Мачулішчах.

***«Самае галоўнае, мы не павінны спыняцца***, — падсумаваў кіраўнік дзяржавы. — ***Калі ўжо пайшоў — ідзі! Грошы, канешне, трэба лічыць, без грошай, без памылак, вядома, гэта не абыходзіцца, але па-мужчынску трэба працаваць — калі ўжо намецілі, значыць, трэба гэта рэалізоўваць».***

**Варвара МАРОЗАВА,**
**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
**Фота БелТА.**

## Каментарый у тэму

Ракетабудаванне — не затратная для дзяржавы галіна, заявіў пазней журналістам **старшыня Дзяржкамваенпрама Раман ГАЛОЎЧАНКА.** Ён адзначыў, што выдаткі дзяржавы на развіццё ракетабудаўнічай галіны ўжо шматразова акупіліся за кошт замежных кантрактаў на пастаўку гэтага ўзбраення.

Па словах кіраўніка ведамства, рынкі збыту знаходзяцца па ўсім свеце, асноўны рэгіён — Блізкі Усход, Афрыка, Паўднёва-Усходняя Азія. Гэта краіны, якія не маюць уласнай вытворчасці, альбо для якіх занадта дарагія заходнія ўзоры, дадаў ён.

Дасягнутыя дагэтуль вынікі праграмы Раман Галоўчанка назваў значнымі.

«Па-першае, ракетны комплекс «Паланэз-М» — далёкасць яго выкарыстання павялічаная з 200 да 300 кіламетраў. Такім чынам, зона паражэння таксама павялічылася да 300 кіламетраў. Вядзецца работа над стварэннем новых тыпаў боеприпасаў да гэтай сістэмы. Работа вельмі складаная. Гэта практычна ўжо аэракасмічныя тэхналогіі, але мы на правільным шляху, і сённяшняя размова гэта пацвердзіла», — сказаў кіраўнік ведамства.

Побач з ракетным комплексам «Паланэз-М» можна паставіць комплекс зенітна-ракетны «Бук-М3», дадаў старшыня Дзяржкамваенпрама.

«Як мы ўжо не раз казалі, мы адышлі ад паняцця мадэрнізацыі савецкага і расійскага комплексу — гэта першы цалкам беларускі зенітна-ракетны комплекс, — падкрэсліў ён. — Галоўнае, чаго яму не хапала, — уласнай зенітнай кіруемай ракеты. Цяпер ідзе яе дапрацоўка».

За два апошнія гады беларускія распрацоўшчыкі ракет перайшлі ад канцэптаў і мадэляў да рэальна дзеючых узораў, паведаміў Раман Галоўчанка.

«Зараз самае галоўнае — вызначыцца з вектарам далейшага развіцця. Думаю, у найбліжэйшы час мы павінны (і Прэзідэнт таксама пра гэта казаў) шчыльна заняцца самымі складанымі і дарагімі рэчамі — палівам, выбуховым рэчывам баявой часткі. Тут мы пакуль знаходзімся ў пачатковай стадыі, але развіваемся дастаткова хутка. Сёння некаторыя беларускія распрацоўкі выбуховых рэчываў і палівўных энергетычных матэрыялаў былі прадстаўлены. Думаю, гэта вектар будучага развіцця, над якім будзем працаваць у наступнай пяцігодцы больш шчыльна», — сказаў ён.